НА ПАРАДКУ ДНЯ

# Малому бізнесу патрэбна падтрымка

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у рамках «адкрытай прыёмнай», якую правялі на базе адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска, узяла ўдзел у абмеркаванні актуальных праблем і пытанняў, ініцыіраваных суб'ектамі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.**



У прыватнасці, дэталёва і ўважліва разгледзелі пытанні, якія ўзнікаюць пры ажыццяўленні дзяржаўных закупак і закупак за кошт уласных сродкаў, у тым ліку ў рамках пастановы Саўміна «Аб удасканаленні адносін у галіне закупак тавараў (работ, паслуг) за кошт уласных сродкаў». Таксама ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў былі асаблівасці ажыццяўлення закупак у будаўніцтве ў сувязі са змяненнем заканадаўства; маркіроўка тавараў уніфікаванымі кантрольнымі знакамі і сродкамі ідэнтыфікацыі; адміністрацыйная адказнасць за нявыплату абавязковых страхавых узносаў.

Акрамя таго, абгаварылі пытанне аб дзяржаўнай падтрымцы новых бізнес-ініцыятыў і аказанні фінансавай дапамогі бізнесу-пачаткоўцу.

У абмеркаванні важных і актуальных для малога і сярэдняга прадпрымальніцтва тэм удзельнічалі таксама прадстаўнікі Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю, інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Цэнтральным раёне г. Мінска, Мінскага гарадскога ўпраўлення Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Работнікі гэтых дзяржаўных органаў і арганізацый узялі на кантроль агучаныя прадпрымальнікамі пытанні. Адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска рэкамендавана зрабіць такія сустрэчы часткай штодзённай работы, разглядаючы на іх найбольш актуальныя праблемныя пытанні.

НА КАНТРОЛІ

# Зрабілі ўлады, зрабі і сам

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ у рамках кантролю за разглядам калектыўнага звароту жыхароў дома № 80 па вуліцы Нёманскай у Мінску праверыла, як выконваюцца работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, прылеглай да гэтага дома. І зрабіла тое з выездам на месца.**



Як паведамілі ў профільнай камісіі, паводле інфармацыі Мінскага гарвыканкама, 26 жніўня работы па ўладкаванні пад'язных шляхоў і комплексным добраўпарадкаванні дваровай тэрыторыі дадзенага жылога дома былі завершаны: тут з'явіліся сучасная дзіцячая пляцоўка і велапаркоўка.

Сенатар адзначыла, што тэрыторыя сапраўды змянілася. Пры гэтым Таццяна Рунец падкрэсліла, што мясцовыя жыхары таксама павінны ўносіць уклад у добраўпарадкаванне свайго двара.

Бягучай восенню разам з жыхарамі дома будуць пасаджаны дрэвы і кусты на дваровай і прылеглай да яе тэрыторыі.

СЕНАТАРЫ ЗА РАБОТАЙ

# «ГЭТА ВЯЛІКАЯ ПРАЦА — ВЫРОШЧВАЦЬ І ЗБІРАЦЬ УРАДЖАЙ»

**На мінулым тыдні старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ працавала ў рэгіёне: у цэнтры ўвагі сенатара была Століншчына. Тут старшыня профільнай камісіі ўзяла ўдзел у пасяджэнні мясцовага райвыканкама, сустрэлася з працоўным калектывам філіяла «Савушкін прадукт», пазнаёмілася з дзейнасцю Гарынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, наведала шматдзетную сям'ю ў Альшанах і аднайменную фермерскую гаспадарку.**



## Што хвалюе?

Здаецца, пытанне з катэгорыі рытарычных. Камфорт і дастатак заўсёды былі і застаюцца аднымі з галоўных інтарэсаў людзей, незалежна ад месца іх пражывання: ці то сталіца, ці то Століншчына... Таму ў цэнтры ўвагі мясцовай «вертыкалі» ўлады было пытанне выніклаў работы мясцовага ЖКГ і павышэння якасці жыллёва-камунальных паслуг, якія аказваюцца насельніцтву. Як высветлілася, нездарма.

Па выніках разгляду згаданага пытання на пасяджэнні райвыканкама, у якім бралі ўдзел кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый раёна, а таксама старшыні мясцовых Саветаў дэпутатаў, былі агучаны недахопы, што яшчэ існуюць у дзейнасці мясцовай камунальнай арганізацыі. У кіраўніцтва раёна



застаюцца на кантролі пытанні ўводу ў эксплуатацыю кацельні № 37 у г. Давыд-Гарадок, станцыі абезжалезвання ў аграгарадку Рамель, зніжэння страт у цеплавых і водаправодных сетках і іншыя праблемныя тэмы.

Выступаючы перад удзельнікамі мерапрыемства, парламентарый адзначыла, што развіццё сістэмы ЖКГ у першую чаргу павінна быць накіравана на павышэнне якасці і даступнасці ўсіх відаў жыллёва-камунальных паслуг, удасканаленне сістэмы тарыфнай палітыкі, паляпшэнне добраўпарадкавання населеных пунктаў, павышэнне эфектыўнасці кіравання і прафесійнага ўзроўню кадравага саставу.

Па выніках абмеркавання цэнтральнага пытання парадку дня сенатар унесла свае прапановы ў праект рашэння выканкама.

## Жыццё і работа ў рэгіёне

Падчас сустрэчы з працоўным калектывам філіяла ААТ «Савушкін прадукт» парламентарый азнаёмілася з вытворча-гаспадарчай дзейнасцю яго філіяла ў Століне і пагутарыла з работнікамі.

Трэба сказаць, што некалі вядомы Столінскі сыраробчы камбінат з пераходам у найбуйнейшы малочны холдынг усходняй Еўропы яшчэ больш узмацніў свае пазіцыі: за 10 гадоў інвестыцыі ў развіццё вытворчасці склалі больш за 20 мільёнаў долараў. Безумоўна, гэта прынесла свой вынік — асартымент працягвае павялічвацца, якасць прадукцыі — забяспечваць запыты пакупнікоў, а дабрабыт работнікаў — паляпшацца год ад году. На прадпрыемстве цяпер працуюць 312 чалавек, сярэдні заробак перавышае 1,5 тысячы рублёў — для райцэнтра вельмі дастойныя грошы.

На сустрэчы з калектывам прадпрыемства Таццяна Рунец расказала аб структуры і задачах беларускага парламента, рабоце над законапраектамі, якія паступілі на разгляд у Пастаянную камісію Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах. Асаблівую ўвагу сенатар аддала дзейнасці ў якасці члена Канстытуцыйнай камісіі і прапанаваным навацыям.

Сустрэча была дастаткова насычаная, паколькі, акрамя інфармацыйнай часткі з боку парламентарыя, стала карысная для прысутных яшчэ і з пункту гледжання адказаў на агучаныя пытанні: людзей цікавіла развіццё роднага горада, а таксама пашырэнне інфраструктуры. Пасля заканчэння сустрэчы з калектывам Таццяна Рунец правяла асабісты прыём грамадзян.

Адзначым, што знаёмства з вытворчым патэнцыялам рэгіёна пачалося днём раней — з наведвання Гарынскага камбіната будаўнічых матэрыялаў, аднаго з найбуйнейшых вытворцаў керамічнай цэглы і каменя, якія выкарыстоўваюцца як для ўкладкі, так і абліцоўвання фасадаў будынкаў. Прадукцыя гэтага прадпрыемства запатрабаваная на рынках Расіі і Украіны. Шмат жылых дамоў на Століншчыне пабудавана з чырвонай цэглы, якая выпрацоўваецца тут.

## Шматдзетным — асаблівая ўвага

Асобна ў рамках наведвання сенатарам Століншчыны трэба вылучыць паездку ў аграгарадок Альшаны. І вось чаму.

Тут жыве шматдзетная сям'я Міхаіла і Ганны Грыб. Сужэнцы выхоўваюць сем дзяўчынак, жывуць з зямлі і, як той казаў, радуюцца жыццю. Напярэдадні Дня ведаў Таццяна Рунец не магла не завітаць у гэтую сям'ю.

— Сям'я вельмі дружная і гасцінная, вызначаецца працавітасцю, бацька іх шмат майструе сваімі рукамі, — падзялілася ўражаннямі ад свайго візіту сенатар. — Самі ж гаспадары не лічаць сваю сям'ю асаблівай — у Альшанах хапае шматдзетных.

Парламентарый падзякавала гаспадарам за цёплы прыём, пажадала моцнага здароўя і ўручыла бацькам і дзецям падарункі. Павіншаваць вялікую сям'ю з пачаткам навучальнага года прыехалі таксама старшыня Столінскага райвыканкама, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Рыгор Пратасавіцкі, старшыня Альшанскага сельскага Савета дэпутатаў Віктар Гапко.

Фінальным акордам наведвання аграгарадка стала знаёмства з фермерскай гаспадаркай «Альшаны» Івана Грыба. Як прызналася сенатар, Століншчына яе ўразіла і тут. Фермерская гаспадарка на сённяшні дзень — гэта 253 гектары, якія апрацоўваюць больш за сто чалавек. 16 гектараў адведзена пад зімнія цяпліцы, дзе вырошчваюцца таматы.

— Работа не з лёгкіх. Гэта вялікая праца — вырошчваць і збіраць ураджай, — падсумавала вынікі свайго візіту старшыня профільнай камісіі.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА,**
**фота sovrep.gov.by**